УДК 947.6 (411.6) «1914/1916»

# АСВЯТЛЕННЕ МЯСЦОВЫХ І ВАЕННЫХ ПАДЗЕЙ НА СТАРОНКАХ “PINSKER JEITUNG (ПИНСКАЯ ГАЗЕТА)” ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

**М.В. Цуба**
Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, cubanm05@rambler.ru

Восенню 1915 года Беларусь, у выніку ваенных паражэнняў расійскай арміі, была падзелена на дзве часткі: заходнюю ( Гродзенская, большая частка Віленскай і частка Мінскай губерняў), акупіраваную германскімі войскамі, і ўсходнюю.

У занятым 15 верасня 1915 года Пінску германскія акупацыйныя ўлады праследавалі ў першую чаргу свае інтарэсы. Галоўнай іх мэтай з’яўлялася выкачаць як мага больш матэрыяльных каштоўнасцяў з акупіраваных тэрыторый на карысць Германіі. А для таго, каб арганізаваць мясцовае насельніцтва для выканання сваіх распараджэнняў і трымаць сітуацыю пад кантролем было вырашана наладзіць выданне сваёй газеты. Такім чынам у горадзе пачала выходзіць штодзённая, двухмоўная (на нямецкай і расійскай мовах) газета пад назвай “PINSKER JEITUNG (Пинская газета)” . Адказным рэдактарам гэтай газеты акупацыйнымі ўладамі быў прызначаны А. Фрайслер. Дадзеная газета з’яўлялася друкаваным органам пінскай камендантуры. Па загаду гэтай акупацыйнай установы “PINSKER JEITUNG (Пинская газета)” павінна была распаўсюджвацца ва ўсіх гасцініцах і гандлёвых кропках горада.

Газета выдавалася на працягу 1916–1917 гг. Прычым усе загады і распараджэнні, змешчаныя ў газеце, у абавязковым парадку падпісваліся кіраўніком пінскай камендантуры. Згодна з гэтымі подпісамі бачна, што капітан–камендантам камендантуры ў Пінску ў 1916 годзе з’яўляўся барон фон–Бісінг, а ў 1917 годзе гэту пасаду ўжо займаў Безелер.

Рубрыка “PINSKER JEITUNG (Пинская газета)” складалася з розных паведамленняў мясцовага характару, а таксама з абмеркавання і аналізу ваенных дзеянняў з розных тэатраў Першай сусветнай вайны з германскага пункту гледжання. Усе газетныя нумары фактычна былі запоўнены рознымі аб’явамі, папярэджваннямі, загадамі і распараджэннямі пінскай камендантуры. Як, напрыклад: “ Усе рэчы, альбо часткі рэчаў з жоўтай медзі, волава, цынка, чырвонай медзі, бронзы, алюмінія і нікеля (гэта значыць самавары, катлы, ванны, куўшыны, ручкі дзвярэй, абшыўкі і г.д.) лічацца пад арыштам і на іх павінны быць пададзены заявы ў камендантуру. Гэтыя прадметы па неабходнасці будзе купляць ваеннае ўпраўленне за налічныя грошы… тых хто не напіша заяву альбо схавае гэтыя рэчы чакае пакаранне грашовым штрафам альбо арыштам”. У гэтым жа нумары газеты паведамляецца таксама, што “ З 8–га па 31 мая 1917 года ( за выключэннем святочных дзён) мясцовы склад сырых матэрыялаў, вул. Брэсцкая, 47, купляе ў жыхароў скуры і кожы за налічныя грошы … Непрададзеныя скуры да 1 чэрвеня 1917 года лічацца пад арыштам і за іх канфіскацыю выплата грошай не прадугледжана” [1].

Тым ня менш, акупацыйнымі ўладамі праяўлялася пэўная ўвага да найбольш збяднелай часткі жыхароў Пінска. Напрыклад, у аб’яве абывацельскага камітэта зазначаецца: ” З выпадку часовай затрымкі дастаўкі мукі для горада, вырашана прадаваць у нашых лаўках выпячаны хлеб толькі для той часткі насельніцтва, якая мае самую вострую патрэбу ў гэтым” [2]. Аб тым, што забяспячэнне гараджан хлебам было сапраўды праблематычным і жыццё істотнай часткі пінчан было на мяжы голада, раскрываецца ў падпісаным камендантам “Папярэджанні”, хутчэй тлумачэнні. Тут паведамляецца, што “… у горадзе цяжка хварэюць ад таго, што ядуць хлеб, выпячаны з дзікага гарошку з дабаўкай мукі. У горадзе продана вялікая колькасць дзікага гарошку. Гэты дзікі гарошак не



Полесгу

можа быць выкарыстаны як ежа для людзей, ён ядавіты, але яго можна выкарыстоўваць як корм для жывёлы” [3].

Да важнага напрамку дзейнасці германскіх акупацыйных улад у Пінску адносілася сельская гаспадарка. У выніку без дазволу камендантуры забаранялася: прадаваць мяса альбо мясапрадукты, карміць коней аўсом, лавіць рыбу, прадаваць прадукты новага ўраджаю, забіваць жыўнасць. Акупанты імкнуліся як мага больш выкачаць для патрэб Германіі сельска–гаспадарчых прадуктаў з мясцовага насельніцтва. Пагэтаму стараліся трымаць усё пад сваім кантролем. У артыкуле “Адносна сельскай гаспадаркі” паведамляецца, што “усе жыхары, якія валодаюць зямлёй, павінны падаць у камендантуру наступныя дадзеныя:

1. Дакладнае распалажэнне агародаў і палёў.
2. Вялічыну агульнай зямельнай плошчы.
3. Вялічыну плошчаў засеяных азімымі.
4. Вялічыну плошчаў засеяных бульбай.
5. Вялічыну плошчаў засеяных яравымі хлебамі.
6. Якія сорты семян ёсць у запасе і якія патрэбны …

Кожны абавязаны надлежачым чынам апрацоўваць зямлю; ні адна паласа не павінна заставацца неапрацаванай. Хто няправільна альбо без дазволу камендантуры прысвоіць сабе зямлю, ці не напіша заяву, спозніцца альбо напіша не адпавядаючыя рэчаіснасці звесткі, будзе строга пакараны, акрамя таго ён бязвыплатна пазбавіцца права карыстацца зямлёй”. [4]

У кожнай выдадзенай газеце існавала рубрыка “афіцыйныя паведамленні германскага вышэйшага ваеннага ўпраўлення”. Тут давалася кароткая характарыстыка баявым дзеянням на франтах першай сусветнай вайны, прапагандаваліся моц нямецкай зброі і поспехі германскіх войск. Патрэбна адзначыць, што ў дадзеных публікацыях найбольшая ўвага ўдзялялася не мясцоваму (усходняму) тэатру ваенных дзеянняў, а заходнееўрапейскаму. Часта старонкі газеты былі запоўнены падобнай інфармацыяй: ”Акрамя значнай разведвальнай дзейнасці , нашы лётчыкі паспяхова атакавалі чыгуначныя забудовы праціўніка і месцы дыслакацыі варожых войск, у першую чаргу паблізу чыгункі Клермон–Вердэн. Тры аэрапланы праціўніка знішчаны, два ў Шампані і адзін каля Мааса. На Усходнім і балканскім франтах становішча ўвогуле без змен” [5].

Аднак у хуткім часе перамогі для Германіі змяніліся цяжкімі паражэннямі, асабліва пад французскім Вердэнам. Дадзеныя факты не друкаваліся ў “PINSKER JEITUNG (Пинская газета)”, але да агульнай жалобы ў Германіі, з нагоды такіх падзей, павінна была далучыцца насельніцтва на захопленных немцамі тэрыторыях. Аб чым чытаем: “У перыяд з 5 па 7–е красавіка цякучага года (уключна) забаронена ўсялякае музыкальнае выкананне. 5 і 6 красавіка ц.г. кінаматографы павінны былі быць закрыты. Пінск. 3 красавіка 1917 г. (подпіс) Безелер, капітан і камендант” [6].

Такім чынам, “PINSKER JEITUNG (Пинская газета)” бяспрэчна з’яўлялася праваднікам палітыкі германскіх акупацыйных улад у пінскім рэгіёне. Тым ня менш, у ёй змяшчалася шмат самай рознай інфармацыі пра падзеі таго часу, дзякуючы чаму сёння лягчэй уявіць, асэнсаваць і зразумець рэаліі, існаваўшыя падчас Першай сусветнай вайны на Піншчыне.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Объявление// PINSKER JEITUNG. (Пинская газета).– 1917.– 7 мая.
2. Объявление// PINSKER JEITUNG. (Пинская газета).–1916.–14 марта.
3. Предупреждение // PINSKER JEITUNG. (Пинская газета).–1916.–14 марта.
4. Относительно сельского хозяйства// PINSKER JEITUNG. (Пинская газета).–1917.–22 января.
5. Официальное сообщение германского высшего военного управления// PINSKER JEITUNG. (Пинская газета).–1916.–14 марта.
6. Объявление// PINSKER JEITUNG. (Пинская газета).– 1917.–4 апреля.

ПолесГУ